# Калекцыя «Мова»

**Да Міжнароднага дня роднай мовы ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстаўка «Гадзіна мовы». Экспазіцыю прэзентавалі галоўная кніжніца краіны і Мінскі гадзіннікавы завод.**




На выстаўцы ўпершыню прадстаўлена сем мадэляў гадзіннікаў лімітаванай калекцыі «Мова», выпушчаных у 2019—2022 гадах. Апошнія рэлізы калекцыі прысвечаны народнаму паэту Беларусі Пімену Панчанку да 105-годдзя з дня яго нараджэння. За аснову дызайну быў узяты першы зборнік вершаў паэта — «Упэўненасць» (1938), у якім усхваляецца хараство і багацце роднай зямлі.

Імя Пімена Панчанкі, паэта і публіцыста, крытыка і перакладчыка, добра вядома прыхільнікам айчыннай літаратуры. Галоўнае ў яго творчай спадчыне — вершы, дзе выказваюцца думкі і надзеі эпохі, вершы, дзе адлюстроўваецца багатая гама чалавечых пачуццяў. Яго паэзія, непаўторная і глыбока нацыянальная, назаўжды ўвайшла ў залаты фонд беларускай літаратуры мінулага стагоддзя.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі ўнучка Пімена Панчанкі — Кацярына Панчанка, дызайнеры і аўтары калекцыі «Мова» з Мінскага гадзіннікавага завода.

**Міра ІЎКОВІЧ**